# РЭФЕРЭНДУМ 2022: РАЗАМ У БУДУЧЫНЮ






**На апошнюю нядзелю лютага прызначана правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму па актуальным пытанні ўнясення змен і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.**

Непасрэдны ўдзел у такой важнай для кожнага грамадзяніна падзеі прымаюць супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты ВДУ імя П.М. Машэрава. У тым ліку прадстаўнікі нашага ўніверсітэта задзейнічаны ў рабоце ўчастковых камісій.

**Дзяніс ШКІР'ЯНАЎ, прарэктар, старшыня ўчастковай камісіі № 58 Першамайскага раёна г. Віцебска:**

«Мне ўпершыню выпала магчымасць стаць старшынёй аднаго з выбарчых участкаў. Гэта вялікая адказнасць, шмат чаго для мяне ў гэтай дзейнасці новага, але ж дзякуючы існуючым алгарытмам, я ведаў, што, як і калі трэба рабіць. Адзначу, што напярэдадні рэферэндуму адміністрацыя Першамайскага раёна праводзіла зборы для членаў камісіі, дзе яны атрымлівалі раздатачны матэрыял і пэўныя ўстаноўкі. Лічу, што рэферэндум – значная падзея для нас і нашай будучыні. Кожны грамадзянін павінен усвядоміць, наколькі сёння важна прыняць гэтыя змены ў Канстытуцыі краіны».

**Васіль БАРАНОК, дацэнт кафедры карэкцыйнай працы, старшыня ўчастковай камісіі № 19 Першамайскага раёна г. Віцебска:**

«Выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні рэферэндуму. На базе нашага ўніверсітэта працуюць тры участковыя камісіі. На адной з іх, на ўчастку № 19, у галасаванні прымаюць удзел студэнты-машэраўцы. Многія з іх ужо аддалі свой голас датэрмінова. Гэта тыя хлопцы і дзяўчаты, якія адчуваюць асабістую адказнасць за лёс любімай Радзімы».

Дарэчы, прагаласаваць можна як у асноўны дзень (27 лютага) з 8 да 20 гадзін, так і датэрмінова – з 22 па 26 лютага. Гэтай магчымасцю скарысталіся студэнты ВДУ, якія загаддзя прыйшлі на ўчастак для галасавання № 19.

**Вольга КОШТАЛЕВА, студэнтка 2 курса ЮФ:**

– Я вырашыла аддаць свой голас адной з першых, бо сёлетні рэферэндум – знакавая падзея ў маім жыцці. Я галасую за росквіт нашай роднай Беларусі. Дарэчы, я працую галоўным спецыялістам ПА ГА «БРСМ» ВДУ імя П.М. Машэрава з правамі РК, бо лічу, што за моладдзю – будучыня.

**Анастасія ЗАЙЦАВА, студэнтка 2 курса ФМІІТ:**

– Я заўсёды займаю актыўную грамадзянскую пазіцыю і лічу, што калі ў цябе ёсць магчымасць паспрыяць развіццю роднай дзяржавы, то трэба абавязкова ёй скарыстацца. У тым ліку прыняць удзел у рэферэндуме па такім важным і актуальным пытанні, як унясенне змен і дапаўненняў у асноўны закон краіны.

# РЭФЕРЭНДУМ 2022: РАЗАМ У БУДУЧЫНЮ

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

**Ілля ДАРОЖКА,**
**студэнт 3 курса ЮФ:**

«Дзякуючы шматлікім дыялогавым пляцоўкам, якія праходзілі ў нашым універсітэце, і комплекснаму падыходу па абмеркаванні праекта Канстытуцыі сумесна з прадстаўнікамі ўлады, мы, студэнты, змаглі якасна разгледзець усе навaўвядзенні, атрымаць магчымасць задумацца, як кожны з нас можа паўплываць на развіццё Беларусі.

Я абавязкова прыму ўдзел у рэферэндуме, бо хачу быць дастойным грамадзянінам сваёй краіны».

**Карына ЯГОРАВА,**
**студэнтка 1 курса ФХБіГН:**

– Я лічу, што прыняць удзел у галасаванні павінны ўсе беларусы. Бо ад кожнага з нас залежыць, у якой краіне мы будзем жыць, вучыцца і працаваць. Хочацца, каб наша жыццё мянялася толькі ў лепшы бок.



**Андрэй КРОТАЎ,**
**студэнт 3 курса ФГіМК:**

– Час не стаіць на месцы, усё рухаецца і развіваецца вельмі хутка. Рэспубліка Беларусь – яркі таму прыклад. І толькі нам, беларусам, вырашаць, якім будзе наш заўтрашні дзень. Менавіта таму мы ўносім змены і дапаўненні ў аснову, у падмурак функцыянавання нашай дзяржавы і грамадства – у Канстытуцыю. Я заклікаю кожнага грамадзяніна Беларусі прыняць актыўны ўдзел у гістарычнай, знакавай падзеі – у рэферэндуме.

**Меркаванні збірала Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Зварот рэктара Валянціны Багатыровай напярэдадні рэспубліканскага рэферэндуму глядзіце з дапамогай QR-кода.